*В. С. Болбас,*
*аспірант Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны*

# Добрых нораваў крыніца

*Ф. Скарына і М. Гусоўскі аб маральным выхаванні*

***XVI стагоддзе было шмат у чым паваротным у гісторыі Беларусі. У прыватнасці, яно дало надзвычай магутны імпульс развіццю нацыянальнай грамадскай і педагагічнай думкі. На світанку новай эпохі ў суровых умовах феадальнай рэчаіснасці нараджаліся новыя погляды на ролю і прызначэнне чалавека, што вяло да рэвалюцыйнай ломкі сістэмы маральных каштоўнасцей сярэднявечча. Закладваліся новыя асновы тэорыі маральнага выхавання, каштоўнасных арыентацый і этнапедагагічных установак. Дарэчы, такія працэсы досыць сугучны адраджэнскім накірункам духоўнага жыцця нашых дзён.***

Першапраходцам у справе карэннага пераасэнсавання ранейшых, абумоўленых дыктатам царквы сярэдневяковых маральных нормаў і прынцыпаў, актыўным творцам нацыянальнага рэнесансна-гуманістычнага руху з'явіўся тытан беларускага Адраджэння Францыск Скарына. Дамінуючым у яго сінтэтычным светапоглядзе быў этычны аспект. Галоўнай жа заслугай Скарыны ў распрацоўцы тэарэтычных ідэй было ўвядзенне ў этычны пошук свецкіх пачаткаў; на іх грунтавалася потым уся нацыянальная сістэма маральнага выхавання.

Паводле сярэдневяковых багаслоўскіх вучэнняў, чалавек на зямлі павінен быў вызначацца аскетызмам, каб пакорлівасцю і цярпеннем заслужыць сабе лепшую долю на тым свеце. Не згаджаючыся з такім поглядам на прадвызначэнне чалавечага лёсу, мысліцель арыентуе людзей на рэальнасці "...сегосветнаго жития" [6; 21]*. Прычым арганізацыя такога жыцця, на яго думку, шмат у чым залежыць ад самога чалавека, які можа і нават павінен удасканальваць сваю прыроду. Пры выданні біблейскіх кніг, змест якіх "...добрых обычаев и дел научаеть" [6; 25], асветнік імкнецца шукаць вытокі маральнасці не на небе, а на зямлі. У адной са сваіх прадмоў ён падкрэслівае, што "...царство небесное еже ест земля живых" [10; 41].

Усведамляючы важнае значэнне маральнага выхавання ў жыцці грамадства, Скарына перасцерагае , што "...без страху божия, без мудрости и без добрых обычаев не ест мощно почтиве жити людем посполите на земли" [6; 22]. Галоўную ж выхаваўчую мэту ён сфармуляваў так: "Да совершенен будеть человек божий и на всяко дело добро уготован" [6; 17].

Паклаўшы ў аснову маральнага выхавання кодэкс вышэйшых духоўных дабрачыннасцей хрысціянскай этыкі, Скарына яго гуманістычна пераасэнсоўвае, напаўняе новым зместам, тым самым, па сутнасці, істотна змяняе першааснову. Так, напрыклад, рамкі евангелічнага паняцця "...любоў да бліжняга" расхінуты ім настолькі шырока, што яно ўжо распаўсюджваецца не толькі на "простого и посполитого" чалавека, а нават і на людзей іншых канфесій — "иноверцев". Узняўшы любоў на такую вышыню, галоўным крытэрыем маральнасці мысліцель лічыць чалавекалюбства і справядлівасць: імі павінен кіравацца кожны — незалежна ад паходжання і сацыяльнага становішча. Яму ж належыць і "залатое правіла" маральнасці": "То чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, и того не чинити иным, чего не хощеши от иных имети" [6; 62], што, па сутнасці, дае права чалавеку на самастойную маральную ацэнку і рэгуляцыю сваіх паводзін. Таму не выпадкова тое, што, побач з біблейскімі, у працах Францыска Скарыны з'яўляюцца істотна новыя, рэнесансна-гуманістычныя асобасныя дабрачыннасці: інтэлектуалізм, індывідуалізм, дэмакратызм, нацыянальны патрыятызм. Любоў, "великую ласку" да радзімы Скарына разглядаў як адно з найкаштоўнейшых чалавечых пачуццяў, як аснову зместу маральнага выхавання. З цягам часу прыхільнасць да гэтай скарынаўскай ідэі зрабілася адметнасцю нацыянальнай этыка-педагагічнай сістэмы.

Значную ўвагу мысліцель надаваў паказу шляхоў выхавання маральнасці: асноўным стратэгічным кірункам ён лічыў асвету самых шырокіх слаёў насельніцтва. Веды і розум, па глыбокім перакананні Скарыны, з'яўляюцца базай фарміравання добрых нораваў і звычаяў, таму ў іх нашмат больш каштоўнасцей, "...нежели во тленных великих царских сокровищах" [6; 24]. У Біблії ён бачыў крыніцу маральных нормаў і выдатны сродак духоўнага выхавання: "...пожиточьны же суть сие книгы чести всякому человеку: мудрому и безумному, богатому и вбогому, младому и старому" [6; 22]. Таму адной з мэт выдання кананізаваных кніг на роднай мове было жаданне беларускага першадрукара паспрыяць маральнаму абнаўленню грамадства. Асветнік адзначаў, што чалавек з кніг можа чэрпаць "...добрыя нравы яко бы со источника" [6; 18].

* Арфаграфія першакрыніц па магчымасці захаваная.

Чалавечае пазнанне, на думку Францыска Скарыны, не мае межаў. У сваёй апантанасці гэтай рэнесансна-гуманістычнай ідэяй ён уздымаецца аж но да асэнсавання неабходнасці пазнання чалавекам самога сябе: “Ест наивышшая мудрость размышление смерти и познание самого себе” [6; 20]. Спасціжэнне ўнутранага свету індывіда з’яўляецца ў Скарыны зыходным момантам маральнага ўдасканалення асобы.

Важную ролю ў маральным выхаванні асветнік надае такому метаду, як прыклад. Амаль увесь змест выдадзеных ім кніг складаецца са збору нравапавучальных легенд і гісторый, бо яны — “...всех добрых нравов сокровище”, што дапамагае ўзняцца да вяршынь “...мудрости и к добрым обычаем” [6; 25]. Сапраўдны педагог, які ўсім сваім жыццём дэманстраваў узор для пераймання, пісаў, што даволі часта выхаванне “...приводит нас к святости и к добрым делом путем прикладу” [6; 25].

З традыцыйна хрысціянскіх пазіцый Ф. Скарына разглядае ролю бацькоў у маральным выхаванні дзяцей, надаючы важнае значэнне трываласці і добранадзейнасці сям’і, “...незгода бо и найболшие царства разрушаеть” [6; 111]. Ён падкрэслівае , што “...мужи с своими женами имають во любви жити... чада, абы слухали и честовали родителей своих. Родители же дабы питали и навчали чада своя” [6; 116].

Скарына ўнёс значны ўклад у развіццё эстэтычных поглядаў свайго часу і, як прадстаўнік рэнесансна-гуманістычнай думкі, арыентаваў іх у асноўным на дасягненне этычных мэт. У яго працах эстэтычнае выхаванне ў значнай ступені выступае як сродак маральнага фарміравання чалавека і грамадства.

Неаднаразова звяртаючыся да духоўнага свету асобы, вучоны належным чынам звярнуў увагу і на “красоту телесную”. Ён падкрэсліваў, што мудрасць — “...лекарства душевные ... і телесные” [6; 46], тым самым фактычна сцвярджаючы думку аб неабходнасці арганізацыі фізічнага выхавання і аб яго сувязі з разумовым і маральным.

Вялікую ўвагу пытанням маральнага выхавання надаваў сучаснік Францыска Скарыны, аўтар аднаго з найярчэйшых твораў сусветнай літаратуры XVI ст. — “Паэмы пра зубра”, — Мікола Гусоўскі. Блізкая сувязь з простым народам дазволіла яму больш глыбока ў параўнанні са Скарынам звязаць маральна-этычныя вышукі з рэальным жыццём, узбагаціць іх элементамі паўсядзённай рэчаіснасці. Асноваполажным можна лічыць падыход М. Гусоўскага да ацэнкі маральнага выхавання, які ён сфармуляваў шырока вядомымі сёння словамі: “Дзяржава абапіраецца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела” [1; 52]. Гэтую ж думку ён падкрэсліў і ў іншым месцы: “Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы росквітам княства Літоўскага, нашага краю, і называюць той век златым”, бо “...дзяржаўца перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна ставіў багацце духоўнае — злата дзяржавы” [1; 104].

Як бачым, і шчасце, і слава разглядаюцца нашым славутым земляком як вынікі высокай духоўнасці. Ён задумваецца над сэнсам чалавечага існавання і прыходзіць да высновы, што чалавек — галоўнае тварэнне



Бога і спрадвечна ў свеце ўсё ўладкавана такім чынам, каб кожны быў шчаслівым: “Няма нічога на зямлі, каб не створана было дзеля шчасця — усім чалавек цешыцца, усё яму карысць прыносіць” [4; 180]. У гэтых радках — думкі з канцэптуальных палажэнняў эпікурэйскай этыкі аб імкненні чалавека да асалоды. Аднак М. Гусоўскі не замыкаецца ў вузка утылітарных , геданістычных, падыходах пры вызначэнні сэнсу жыцця: праз усе яго творы праходзяць ідэя аб неабходнасці арыентацыі ў бок агульнага дабра і думка, што чалавек можа ўвекавечыць сваё імя толькі заслугамі перад грамадствам. Пачуццё абавязку перад людзьмі як адзін з асноўных крытэрыяў маральнасці — лейтматыў усёй літаратурнай спадчыны беларускага паэта.

Вытокі многіх бед бачыць М. Гусоўскі ў тым, што людзі не прытрымліваюцца тых маральных законаў, якія выпрацаваны продкамі. Ён піша: “Лепш захаваў бы народ непарушна ў душы векавечна тое, што наказвалі сцерагчы нашы продкі” [4; 159]. На яго думку, маральна-духоўнае ўдасканаленне грамадства дапамагло б не дапусціць татарскага і турэцкага нашэсцяў на Еўропу, перамагчы чуму ў Рыме і здзейсніць многія іншыя цудадзействы, якіх людзі чакаюць ад Бога. Назіранні за паўсядзённым жыццём простага люду даюць мысліцелю падставу лічыць, што ў рэшце рэшт сам чалавек з’яўляецца творцам свайго шчасця: “Справу сваю абараняеш сваімі рукамі і ў іх жа трымаеш свой лёс” [1; 146].

Гусоўскага трывожаць прычыны невысокага ўзроўню маральнасці ў грамадстве, нетрываласць веры. Нават Хрыстос, які быў пасланы Богам дзеля ўратавання людзей, “...усё ж не змог навесці на праведны шлях павучаннем” [4; 173]. Адну з прычын такой няўдачы паэт бачыць у адсутнасці канкрэтнай мэты: “Верылі людзі, але чакалі, ці ж з’явіцца мэта, ці ж можна будзе прычыны ўбачыць” [4; 173]. Таму паэт спрабуе ў якасці такой выхаваўчай мэты стварыць ідэальныя вобразы як прадстаўнікоў асобных саслоўяў, так і чалавецтва наогул. Узорам дзяржаўнага мужа, кіраўніка і выхавацеля ў яго творчасці выступае князь Вітаўт, якога М. Гусоўскі малюе як шматбакова развітую асобу. Ён надзяляе князя шэрагам дабрачыннасцей — такіх, як розум, высакародства, справядлівасць, патрабавальнасць, ваяўнічасць, суровасць, нявычварнасць, чуласць да падначаленых і інш. Аддаючы належнае ролі аўтарытэту выхавацеля, аўтар славутай паэмы асобна адзначае, што адна з заслуг князя заключаецца ў тым, што ён даваў магчымасць праявіць сябе кожнай асобе. Вітаўт заахвочваў сваіх людзей да дабрадзейных учынкаў і ў выніку дабіўся “...найвышэйшага ўздыму Княства Вялікалітоўскага” [1; 94]. Аўтар славутай паэмы ачалавечвае зубра, надзяляе яго душой, гонарам, сумленнем. Вобраз ляснога волата — увасабленне сілы, мужнасці, высакароднасці. Ён як бы дапаўняе асобныя якасці ідэалізаванага князя. Працяг стварэння маральнага ідэалу наглядаецца і ў персанажах простых людзей беларускай зямлі — кемлівых, спрытных, смелых, адданых сваёй радзіме. Завяршае гэтую галерэю партрэт

аўтара — лірычнага героя паэмы "Песня пра зубра", які ўяўляе высокаадукаванага, гуманістычна выхаванага, дэмакратычна скіраванага чалавека, патрыёта сваёй радзімы і свайго народа.

Паказваючы людзям узор этычнай дасканаласці, гуманіст мастацкімі сродкамі паралельна раскрывае сістэму вартасцей, што павінны быць уласцівымі кожнаму чалавеку. Як і ў Скарыны, у Гусоўскага патрыятызм — гэта адна з якасцей, якая не залежыць ад саслоўнай прыналежнасці яе ўладальніка. Наогул у маральных поглядах мысліцеля выразна назіраецца спроба аддзяліць высакароднасць ад высакароднага паходжання. Так, напрыклад, гонар, у яго разуменні, можа быць здабыты толькі самім чалавекам, а не атрыманы ў спадчыну. Калі апекуна М. Гусоўскага Эразма Вітэліуса, буйнога палітычнага і грамадскага дзеяча, папракалі нязнатнасцю паходжання, паэт зазначаў: "імя ж табе здабылі годнасць, доблесная праца" [2; 179].

М. Гусоўскі лічыў, што найважнейшай задачай маральнага выхавання з'яўляецца фарміраванне ў чалавеку таварыскіх пачаткаў. Ён паказвае перавагі супольнага спосабу жыцця на прыкладзе зубрынага статку. Магутнасць зубра памяншаецца шматкратна, як толькі ён адаб'ецца ад сародзічаў; таксама і ў людзей: "...чалавек у адзіночку не ведае сваіх пераваг" [3; 57]. Супольнае жыццё з'яўляецца дзейсным сродкам выхавання. Толькі з дапамогай грамадства індывід можа дасягнуць маральных вяршынь, "...бо лепшы праявіцца ў масе" [1; 97].

Можа, не так ярка, як у Скарыны, раскрываецца ў М. Гусоўскага значэнне асветніцкіх каштоўнасцей, аднак без іх паэт не ўяўляе фарміравання прыстойнай асобы. Прычым ён уносіць свае істотныя дапаўненні ў разуменне мудрасці. Ніколі не прыніжаючы кніжных ведаў, бо і сам ён "...свет даўнін вывучаў... па кнігах славянскіх" [1; 59], асветнік лічыць неабходным узгадняць і звяраць іх з жыццёвым вопытам, бо адрыў тэарэтычных вышукаў ад жыцця можа прывесці да сур'ёзных памылак ці наогул не даць ніякіх вынікаў. Сын паляўнічага, які не раз увачавідкі бачыў зубра і паляваў на яго, прачытаўшы аб ім у літаратуры, падмеціў: "Дзіўна, што ў кнігах апісаны ён не дакладна" [1; 58]. Для вучоных-кніжнікаў "пушча — загадка", і Гусоўскі іх папярэджвае: адказы на многія пытанні "...вы не знойдзеце ў кнігах", а вось ён ведае ісціну, бо "...разгадка хаваецца ў лесе" [1; 60].

Патрыятычная накіраванасць маральнасці, якая будуецца на інтэлектуальнай аснове, патрабуе актыўнай жыццёвай пазіцыі чалавека, і Гусоўскі бачыць у ёй галоўны прынцып маральнага выхавання. Само жыццё падштурхоўвае да гэтага: "...пад сонцам ніводнай хвіліны без барацьбы не было на зямлі і не будзе" [1; 68]. Вось чаму свой "мазолісты вопыт" палявання, пераадольвання цяжкасцей мысліцель разглядае як эфектыўны сродак фарміравання духоўнасці. Ён высока цэніць выхаваўчае значэнне летнікаў, арганізаваных Вітаўтам, дзе чалавек гартуецца маральна і фізічна, і паказвае, як з дапамогай спецыяльных практыкаванняў можна развіць розныя маральныя якасці, пазбавіўшыся ад адмоўных і ўдасканаліўшы станоўчыя.



М. Гусоўскі разумее, што цяжка адразу выхаваць у чалавека ўсе вартасці, і папярэджвае аб карпатлівасці і паэтапнасці ў арганізацыі справы выхавання: "Простыя ступені да вяршынь вядуць" [4; 159]. У адпаведнасці з канкрэтнымі акалічнасцямі чалавек можа сам вызначыць характар сваіх паводзін. Асветнік здолеў зразумець, што некаторыя маральныя паняцці, нормы і законы вельмі відазменлівыя: знешне смелы ўчынак не заўсёды можна аднесці да храбрасці, напрыклад калі юнак "...толькі з жадання каханай прыйсціся пад нораў зробіць свой рыцарскі выбрык — і тут жа загіне" [1; 109].

Бадай, самая характэрная асаблівасць, якая вылучыла М. Гусоўскага ў шэрагу іншых беларускіх мысліцеляў свайго часу, — цеснае ўвязванне маральнага выхавання з натуральна-прыродным асяроддзем. Паэт, дзяцінства і юнацтва якога прайшлі ў лесе, удзячна адзываецца аб "школе" прыроды, што выхоўвае ў чалавеку чалавека: "...эліксір маладосці, бадзёрасці духу" [1; 77]. Лес, фізічная праца, паляванне — тыя выхаваўчыя сродкі, што, на яго думку, маюць большую гаючую сілу для душы і цела, чым любое лекавае зелле.

Велізарны выхаваўчы патэнцыял тоіцца ў разумных адносінах чалавека да прыроды. Гуманіст усхваляе княжацкі ўказ аб забароне палявання на самку і яе патомства, ганьбуе тых, хто губіць прыродныя багацці. У многім дзякуючы прыродзе ён прыходзіць да высновы аб уздзеянні прыгожага на выхаванне высокай духоўнасці. Родная беларуская пушча, дзе "...асалода вашаму сэрцу і воку", захапляе яго сваёй прыгажосцю, бо "...тут адпачынак і дзейнасць спалучаюцца трапна" [1; 73 — 74].

Сутыкаючыся з велічным, прыгожым, чалавек маральна ўзбагачаецца, таму Гусоўскі, насуперак пратэстанцкай этыцы, патрабуе рабіць "...святыні ўсё больш прыгажэйшымі", бо "...храма веліч імкнецца розум недасведчаных накіраваць..." [4; 179]. Асветнік высока цэніць сілу ўздзеяння розных відаў мастацтва: "Гуслі і песні чаруюць і страшную сілу маюць" [3; 49]. Каб маральна аздаравіць сучаснае яму грамадства, Гусоўскі прапануе выхаванне людзей пачынаць з маленства, "каб дзіця прывыкала да прыгожага ў раннія гады" [4; 74].

Як і ўсе найбольш значныя мысліцелі эпохі Рэнесансу, выдатны паэт-лацініст лічыў важным метадам маральнага выхавання славеснае ўздзеянне на розум і пачуцці чалавека. Захоплены сілай слова, ён параўноўваў пяро паэта са стралой у руцэ спрактыкаванага воіна, бо з дапамогай слова можна прывесці да дабрачыннасці, а можна — і да заганы. Адным з выхаваўчых метадаў у маральным станаўленні асобы асветнік лічыў заахвочванне і пакаранне. Умела карыстаўся гэтым метадам князь Вітаўт, па заслугах узнагароджваючы лепшых воінаў ці сурова, але справядліва караючы. Як і Скарына, належную ўвагу ў выхаванні Гусоўскі надаваў прыкладу і пісаў, што яно павінна быць ар-

ганізавана такім чынам, каб імёны славутых людзей і герояў вялі землякоў па дарозе велічы, а ў дапаўненне да Скарыны, які браў узоры для пераймання з сюжэтаў біблейскай ці антычнай гісторыі, паэт прапануе шырока выкарыстоўваць і прыклады з навакольнай рэчаіснасці — як найбольш простыя і зразумелыя.

***Такім чынам, спроба нават кароткага агляду асноўных этыка-педагагічных ідэй і поглядаў выдатных прадстаўнікоў беларускай грамадскай і педагагічнай думкі XVI ст. Францыска Скарыны і Міколы Гусоўскага дае падставы сцвярджаць, што перыяд Рэнесансу на беларускіх землях быў адзначаны нараджэннем новай, гуманістычнай маралі і фарміраваннем адпаведных ёй прынцыпаў, на якіх у далейшым будавалася нацыянальная сістэма сямейнага і грамадскага выхавання.***

## Літаратура


1. Гусоўскі М. Песня пра зубра: На лацінскай, беларускай, рускай мовах. — Мн., 1980.
2. Парэцкі Я. У. Невядомыя вершы Міколы Гусоўскага (1523 — 1533гг.) // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Міжвуз. зб. — Мн., 1975. — Вып. 3.
3. Порецкий Я. И. Николай Гусовский. — Мн., 1984.
4. Парэцкі Я. У. Паэма Міколы Гусоўскага "Жыцце Уякінфа" // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства. Міжвуз. зб. — 1974. — Вып. 2.
5. Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны. — Мн., 1991.
6. Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. — Мн., 1990.



*In his article V. Bolbas investigates creative legacy of prominent belorussian educationalists of the XVI th century Frantsisk Skarina and Mikola Gusovsky in the sphere of theory and practice of moral education. The article dwells upon the humanism, innovation and significance for further development of belorussian pedagogical thought of ideas and judgements which we can see in the works of these Titans during Renaissance.*




